У бойках з крывавай дыктатурай белапольскіх акупантаў

Братэрскі комсамол Заходняй Беларусі да 17 МЮД'аўскага агляду

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 201 (1470) | НЯДЗЕЛЯ. 30 жніўня 1931 г.

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 60 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.
Кошт асобнага №—2 кап.

Комсамол заваёўвае позыцыі

Адзін з слаўных атрадаў комсамолу Польшчы—комсамол Заходняй Беларусі—сустракае 17-ты МЮД значнымі посьпехамі. Праведзены ў красавіку 1931 году, амаль пасьля 10-гадовага існаваньня, першы зьезд КСМ ЗБ паслужыў вялікім укладам у яго разьвіцьцё і работу. Комсамол значна пашырыў свой уплыў у масах рабочай і працоўнай моладзі. Ён організаваў і кіраваў радам самастойных выступленьняў моладзі. Пад кіраўніцтвам партыі комсамол Заходняй Беларусі павысіў сваю ролю ў экономічных баёх моладзі. З сваім уплывам пачаў пранікаць у варожыя організацыі моладзі, у масы новабранцаў і салдат. Аб прыкладах работы комсамолу гавораць і матар'ялы юнкораў Заходняй Беларусі, якія мы сёньня друкуем.

Першы зьезд комсамолу Заходняй Бел. паставіў задачу: праз штодзённыя запатрабаваньні моладзі рыхтавацца да рашаючых боек. У цэнтры ўвагі зьезд паставіў задачу мобілізацыі моладзі для зрыву антысавецкай інтэрвэнцыі, якая рыхтуецца польскім фашызмам.

Таксама ня менш важная задача пастаўлена аб наскарэньні процэсу развалу соцыял-фашысцкіх організацый моладзі.

Але комсамол Заходняй Беларусі у сваёй рабоце яшчэ адстае ад узьдыму рэволюцыйнага руху. Ліквідаваць гэта адставаньне магчыма пры далейшай непрымірымай барацьбе на два фронты, перамагаючы правы ўхіл, як галоўную небясьпеку, і „левае" сэктанцтва, як галоўную перашкоду ў павароце саюзу да шырокіх мас працоўнай моладзі. Ад гэтага будзе залежаць далейшы рост уплыву КСМ у масах, наскарэньне процэсу раскладу працівьніка і заваёва новых позыцый.

Комсамол Савецкай Беларусі абавязан цвёрда памятаць, што выкананьнем задач соцыялістычнага будаўніцтва, узмацненьнем інтэрнацыянальнай работы ён дапамагае братэрскаму саюзу Заходняй Беларусі ў барацьбе за вызваленьне працоўных мас Польшчы і Заходняй Беларусі.

На дапамогу бастуючым

Маладыя рабочыя віленскага шклозаводу Шапіры ў апошняй забастоўцы пад кіраўніцтвам комсамолу прынялі актыўны ўдзел. Былі выстаўлены спэцыяльныя патрабаваньні для моладзі: 6-гадзінны рабочы дзень, адкрыцьця вячэрняй школы супроць „цэхавога закону" і г. д. У забастовачным камітэце моладзь была прадстаўлена двума прадстаўнікамі. У часе забастоўкі былі наладжаны масоўкі. дзе бастуючыя рашылі склікаць спэцыяльныя конфэрэнцыі юнацкіх сэкцый і дэлегатаў фабрык. На конфэрэнцыях

прысутнічалі дэлегаты будаўнікоў, швейнікаў, гарбароў, гандлёвых служачых, вучняў і д. л. Конфэрэнцыя была вырашана пачаць агульную кампанію ў карысьць бастуючых сярод рабочай моладзі Вільні. Для кіраўніцтва гэтай кампаніяй быў абраны спэцыяльны камітэт. Сярод віленскіх маладых рабочых былі організаваны масоўкі, прысьвечаныя забастоўцы, сабраны грашовыя сродкі ў карысьць бастуючых і г. д. Так віленскі рабочы маладняк дапамог і падтрымаў бастуючых на прадпрыемствах Шапіры. **Г.**

Ад юнкораў Заходняй Беларусі

РЭВОЛЮЦЫЙНАЯ МОЛАДЗЬ у баявых колёнах рэволюцыі

Яшчэ больш узмацняем барацьбу

Паўгода таму назад соцыял-фашысцкае праўленьне саюзу гандлёвых служачых (Вільня) распусьціла юнацкую сэкцыю. Гэты крок соцыял-фашыстых быў выкліканы тым, што юнацкая сэкцыя кіравала экономічнай барацьбой моладзі, разьбірала конфлікты паміж рабочымі і прадпрыемцамі, організоўвала забастоўкі.

Але маладзёжная не спужалася рэпрэсій соцыял-фашыстых і яшчэ цясьней зьвязалася вакол сваёй профсаюзнай організацыі. Праўленьне юнсэкцыі ня гледзячы на роспуск, ня спыніла і ня спыняе сваёй работы.

Цяпер мы вядзем барацьбу за павышэньне зарплаты моладзі, за палепшаньне нашых экономічных умоў. У часе галадоўкі ў Віленскай турме мы склікалі сходы солідарнасьці маладых рабочых. На сходзе прысутнічала звыш 30 маладых гандлёвых служачых. Сход пастанавіў моральна і матар'яльна падтрымаць барацьбу політзьняволеных.

Урэшце тры маладыя актывістыя былі выключаны соцыял-фашыстымі з профсаюзу. Але рэпрэсіі фашыстых і соцыял-фашыстых ня пужаюць нас. Мы яшчэ больш узмацняем нашу барацьбу. **Л.**

Рыхтуюцца комсамольцы, рыхтуецца і дэфэнзыва

БЕЛАСТОК. Комсамольская організацыя ўзмоцнена рыхтуецца да 17 МЮД'у. Разам з комсамолам рыхтуецца і дэфэнзыва. Усе вуліцы і рабочыя кварталы поўна набіты шпікамі. І вось, на адной з вуліц арыштавалі комсамольца, які вёс пры сабе транспарант, лістоўкі і яшчэ рад рэчаў, неабходных комсамолу. Другія комсамольцы, убачыўшы гэта, накінуліся на шпіка і вырвалі з яго рук арыштаванага.

Расправы садыстага—Мільлера

З Беластоцкай турмы вызвалілі політвязьня Х. Выпусьціўшы з камеры яго прывялі у турэмную канцылярыю. Тут прапанавалі яму зрабіць адбітак сваіх пальцаў.

Х. протэставаў і адмовіўся гэта выканаць. Тады начальнік турмы, кінуўшы політвязьня на падлогу, пачаў таптаць яго нагамі. На гэтым турэмны начальнік не супакоіўся і выклікаў з дэфэнзывы вядомага ахраншчыка-садыстага Мільлера, які забраў політвязьня у дэфэнзывы. Пад кіраўніцтвам Мільлера ў ахранцы пачаліся самыя нячуваныя зьверствы і зьдзекі над політзьняволеным. **Б.**

Супроць высылкі рэволюцыянэраў

Фашысцкі ўрад пачаў масавае высяленьне з Вільні тых таварышоў, якія за рэволюцыйную дзейнасьць калісьці сядзелі ў турме. У сувязі з гэтым мы склікалі сходы маладых рэволюцыянэраў, якім пагражае высылка. Сход прайшоў з посьпехам. Было пастаноўлена супрацівіцца гэтым мерапрыемствам фашысцкага ўраду. Абралі камітэт для вядзеньня гэтай акцыі. Акрамя гэтага, мы выпусьцілі адозву і наладзілі масоўкі.

У пачатку ліпеня мы склікалі мітынг будаўнікоў, на якім прысутнічала 200 чал. На гэтым мітынгу была растлумачана прысутным сутнасьць рэпрэсій фашысцкага ўраду і становішча політзьняволеных.

Рабочыя скончылі мітынг лёзунгамі:

—Супроць высылкі рэволюцыянэраў!

—На абарону політзьняволеных!

—На барацьбу супроць рэжыму Пілсудзкага! (у гэты час Пілсудзкі якраз „гасьціў" у Вільні).

Пасьля мітынгу мы распаўсюджвалі сярод рабочых проклямацыі і заклікалі іх на дэмонстрацыю. **Л.**

Развал у лягеры ворага

Працоўная моладзь Заходняй Беларусі ўсё больш пераконваецца ў тым, што толькі пад кіраўніцтвам компартыі і комсамолу магчымы рэволюцыйны выхад з крызісу. Сярод яе пашыраецца комуністычны ўплыў. Ня гледзячы на тэрор фашысцкага ўраду, растуць рады комсамолу Заходняй Беларусі. Шырыцца і расьце ўплыў комсамолу ня толькі ў масах рабоча-сялянскай моладзі, але і сярод вучнёўства і служачых. Часта бываюць выпадкі раскіданьня комуністычнай літаратуры ў школьных памяшканьнях, адмовы ісьці ў царкву, касьцёл і г. д.

У Вільні, ў Бэрнардынскім садзе, напярэдадні першага жніўня г. г. комсамольцы наладзілі масоўку, у якой актыўны ўдзел прынялі маладыя рабочыя, служачыя і вучні. За час масоўкі было шмат раскідана комуністычнай літаратуры, якая заклікала да актыўных выступленьняў у дзень першага жніўня. Часта на вуліцах і ў прамысловых цэнтрах вывешваюцца чырвоныя сьцягі і расклейваюцца адозвы.

Бачачы ў комсамоле свайго ворага, урад ужывае супроць яго зьверскія рэпрэсіі. Страшэннае прасьледваньне рабочай моладзі адбываецца на кожным кроку. Па вуліцах гарадоў і прамысловых цэнтраў заўсёды швэндаюць політэйскія і шпікі.

На заводах і фабрыках конфідэнтаў і шпегаў поўна заўсёды. За малейшы крок даносяць зараз-жа ў дэфэнзыву, а тая кідае падазроных на ахвяру крывавым турэмным катам. Фашысцкі суд таксама не шкадуе катаржных прысудаў, ён замыкае ў лёхі турмаў на дзесяткі год. Так, у Віленскім акруговым судзе нядаўна адбыўся процэс над маладымі рабочымі, якія абвінавачваліся дэфэнзывай у прыналежнасьці да комсамолу. Фашысцкі суд прыгаварыў т. т. Фрыдлянда Г. Грымблята і Шэнсала—да 6 год катаржных работ кожнага. Маладога вучня з віленскай беларускай гімназіі—Шыдлоўскага А.—засудзіў на 5 год катаргі. У Лідзе адбыўся процэс над 6 маладымі сялянамі, якія таксама абвінавачваліся ў прыналежнасьці да комсамолу: чатырох з іх суд прыгаварыў да 5 гадоў катаргі, астатнім даў па тры гады.

Таксама з мэтай затрымаць рэволюцыянізаваньне ў масах моладзі і сфашызаваць яе—урад стварае фашысцкія організацыі, як „Стралец", „Пржыспасобене войсковэ", „Стоважышэне млодзежы польскей" і шэраг іншых. Яны ставяць мэтай затрымаць радыкалізацыю працоўнай моладзі, абучыць вэенізацыі для разгону дэмонстрантаў і падрыхтоўкі вайны супроць СССР. У гэтыя організацыі ўваходзяць перш за ўсё сынкі абшарнікаў і асаднікаў, якія стараюцца заманіць туды моладзь беднага сялянства, што часта ім удаецца. Але, пад уплывам рэволюцыйнага руху, працоўная моладзь паступова выкрывае здрадніцкую ролю гэтых організацый і выходзіць з іх.

Абрабаваная працоўная моладзь ня можа мірыцца ня толькі з мэтаймкненьнем гэтых організацый, але і з разбойніцтвам абшарніцкіх і асадніцкіх сынкоў. У Хойніцкім павеце ў в. Агажэлі ах нядаўна была наладжана „стральцамі" вечарынка, у часе якой адбылася бойка. Напіўшыся, чалавек 20 „стральцоў" напалі на гуляючую моладзь і пачалі яе зьбіваць. Пасыпаліся камні і палкі, а пасьля і стрэлы. У вынік 15 асоб паранена, з якіх 5 сьмяротна. Падобны факт быў і у м. Рагот а, Слонімскага павету.

Творцы гэтых організацый, якія спэцыяльна прысланы з Польшчы, пазьверску прасьледуюць тых, хто выходзіць з іхных організацый.

Напрыклад, вышаўшы з радоў „Стральца" і „Стоважышэня польскей млодзежы" 18-гадовы К. Бікста ўвачы быў злоўлены „стральцамі" і скатаваны да страты прытомнасьці. Агент польскай дэфэнзывы, закладчык фашысцкіх організацый у Казлоўскай гміне Слонімскага павету, Дамброўскі пагражаў рэвольвэрам маладому таварышу Лябецкаму, які, пакінуўшы рады „Стральца", разгортваў кампанію супроць фашысцкіх організацый.

Аднак ні поліцэйскі тэрор і тэрор самых організатараў ня стрымае процэсу раскладу фашысцкіх організацый. У некаторых вёсках сяляне не дапушчаюць організоўваць у іх „Стральца" і падобных. У м. Казлоўшчыне шпіцэль Касоўскі імкнуўся організаваць „Стральца", але на першым пасяджэньні працоўная моладзь заявіла: „Мы вайны ня хочам і ня пойдзем у мілітарыстычную фашысцкую організацыю. Пасьля гэтага былі праведзены арышты супраціўленцаў. Аднак, і гэта не дапамагло, бо на іх месца станавіліся новыя, якія яшчэ больш актыўна выступалі супроць закладчыкаў фашысцкіх організацый. У в. Лявонавічы Казлоўскай воласьці было тое самае. Фашыстаму Белавусу, які стараўся організаваць „Стоважышэне млодзежы польскей", ніхто не дапамог. У в. Заблоцьце Лідзкага павету год існавала організацыя „Стралец", якая налічвала больш 30 членаў. Організатарам яе прыслан спэцыяльны шпіцэль з Польшчы—нейкі Віткоўскі, які адначасна працуе і ў дэфэнзыве, прадаючы рэволюцыйных рабочых і сялян. Зразумелыя здрадніцкі чын Віткоўскага і яго організацыі, працоўная моладзь пачала пакідаць яе рады. У выніку зараз організацыя „Стралец" у Заблоцьці зусім ліквідавана, у ёй застаўся толькі адзін Віткоўскі з двума сваімі памочнікамі. Тое самае цяпер і ў Друі каля Вільні, дзе організацыя „Стралец" існавала больш паўгода. Спачатку было некалькі сот членаў, а цяпер організацыя разваліліся.

Фашысцкія організацыі моладзі ідуць па шляху развалу. Але расьце і мацнее комуністычны саюз моладзі. Ён організоўвае масы маладых рабочых і сялян пад кіраўніцтвам компартыі на барацьбу за сваё соцыяльнае і нацыянальнае вызваленьне. **Ю. Т.**

У турме ад XV да XVII-МЮД'у

Яшчэ 15 МЮД 1929 году нам удалося правесьці ў турме надта ўрачыста. Тады яшчэ існавалі адваяваныя ў 1926 годзе такія-сякія правы політзьняволеным. Мы дабіліся дазволу організаваць комуну, мець бібліотэку, двухгадзінную прагулку, зьбірацца разам у адну камэру і організаваць свой клюб.

У дзень 15 МЮДу, раніцою, пасьля сьнеданьня ўсе політвязьні, прычапіўшы да грудзей чырвоны бант, выходзілі на прагулку. Пастроіўшыся ў рады, спакойна хадзілі. Навакол хадзілі, паглядаючы зьверам, узброеныя наглядальнікі. Начальнік турмы, інспэктар і яго памочнікі зорка сачылі за намі.

Нас было чалавек больш 150. Раптам сярод нас раздаўся кліч:

— „Таварышы!!!"—усе ўздрыгануліся. На ўзвышаным месцы стаў малады комсамолец, апрануты ў чорную кашулю з вялікім чырвоным бантам на грудзёх. Твар яго быў бляды, вочы гарэлі агнём. Пасьля яго кароткай прамовы ўсе пачалі сьпяваць „Інтэрнацыянал".

Начальнік астрогу загадаў, каб нас разагналі. Наглядальнікі кінуліся на нас і пачалі заганяць у камэры. У вастрозе мы зноў сабраліся ў адну камэру і працягвалі справу.

Спачатку адзін з нашых таварышоў зрабіў даклад аб міжнародным юнацкім дні, а пасьля пачалі складаць прывітаньні нашым таварышом, якія сядзяць у іншых турмах фашысцкай Польшчы і таварышом, якія змагаюцца на волі.

Сьвяткаваньне 16 МЮДу ў 1930 годзе прашло зусім ужо ў іншых умовах. Фашысцкі ўрад Польшчы, у спудзе перад нарастаючым рэволюцыйным рухам, у некалькі раз узмацніў белы тэрор. З вясны 1930 году фашысцкая турэмная адміністрацыя пачала на нас шалёны наступ. Яна адабрала агульную прагулку, забараніла комуну, адабрала нашу бібліотэку, пазбавіла нас політычных правоў, прыраўнала нас з крымінальнікамі.

У адказ на гэта, мы рашуча протэставалі і змагаліся за тое, каб зьвярнуць нашы правы. Мы наладжвалі некалькі раз 2-3 дзённыя галадоўкі, не хадзілі зусім на прагулкі і г. д.

Аднак, фашысцкая адміністрацыя правы нам не зьвярнула, а яшчэ горш закавала ў ланцугі крывавага рэгляманту.

У дзень 16 МЮДу нас на прагулку ня пушчалі. Сядзелі мы ўсе па сваіх камэрах. Наглядальнікі хадзілі і сілай зрывалі ў кожнага чырвоныя банты. Хто гэтаму супраціўляўся, каталі.

Як раз аб 11 гадзіне мы ўсе пачалі на ўвесь астрог сьпяваць „Інтэрнацыянал" і кідаць розныя авты ваенныя лёзунгі. Адным словам, зрабілі гучную дэмонстрацыю. Наглядальнікі, як зьвяры, бегалі па камэрах і пагражалі. Аднак іх ніхто ня слухаў.

На другі дзень астрожная адміністрацыя пачала нас караць. Шмат хто з нашых таварышоў за дэмонстрацыю прасядзеў па некалькі сутак у карцэры. Шмат хто страшэнна быў зьбіты.

17 МЮД мы сустрэнем у абставінах нябывалага дагэтуль крывавага тэрору. Але ня гледзячы на гэта, мы ўсе, як адзін, актыўна выступім і пакажам ворагу сваю гатоўнасьць на апошні рашаючы бой за пролетарскую рэволюцыю.

Політвязьні Горадзенскай турмы.

Рапартам гаспадарчых перамог сустрэне 17 МЮД шматмільённы

Інтэрнацыянальнае выхаваньне—слабое зьвяно нашай работы

Кожны дзень набліжае нас да 17 МЮДу. Рад арганізацый правільна зразумеў палітычную сутнасьць гэтага дня і сустракаюць яго з папоўненымі радамі — ударнымі брыгадамі і гаспадарчымі перамогамі. Аднак, рад другіх арганізацый яшчэ не прыступіў да падрыхтоўкі к МЮДу.

Падрыхтоўка да МЮД'у павінна ісьці пад знакам барацьбы за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, пасьпяховага скончаньня ўборачнай і падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы. Гэтую барацьбу патрэбна ўвязаць з арганізацыяй комсамольскіх ячэек ў колгасах і выкананьнем лёзунгу—„100 проц. рабоча-батрацкай моладзі ў комсамол".

З прарывам мы ідзем к МЮДу ў галіне інтэрнацыянальнай работы. Гэта зьвяно недапушчальнае. Перабудаваўшы формы і мэтады інтэрнацыянальнай работы, зрабіўшы яе штодзённай справай комсамольскіх ячэек, мы павінны ўзьняць яе тэмпы і якасьць.

МЮД—важнейшая палітычная кампанія, а таму правядзеньне яе павінна стаць справай усіх партыйных, профсаюзных і інш. арганізацый. МЕНСКІЯ БАЛЬШАВІКІ ўключыліся ў правядзеньне МЮДу. Прыкладу Менскай партыйнай арганізацыі павінны пасьледваць усе партыйныя арганізацыі Беларусі.

Бальшавікі Менску ўключаюцца ў правядзеньне МЮД'у

Бюро гаркому КП(б)Б лічыць, што правядзеньне МЮД'у зьяўляецца важнейшай палітычнай кампаніяй, якая ня можа прайсьці па-за ўвагай партыйнай арганізацыі, а патрабуе максімуму ўвагі ня толькі з боку комсамолу, але і партыйных арганізацый.

Выходзячы з гэтага, бюро гаркому КП(б)Б пастанаўляе:

Абавязаць усе парколектывы і ячэйкі КП(б)Б забясьпечыць належным партыйным кіраўніцтвам і дапамогай колектывы і ячэйкі КСМ у справе падрыхтоўкі да правядзеньня МЮД'у, у выкананьні задач павышэньня ролі комсамолу ва ўсіх галінах соцбудаўніцтва і правядзеньні масава-прапагандысцкай працы к МЮД'у, прыцягваючы да гэтага фабрычна-заводзкі і масцовы друк.

Прапанаваць фракцыям гарсавету і гарпрофсавету, Белсампрамсаюзу, Асовіяхэму і іншым гарорганізацыям забясьпечыць прасоўваньне ў профсаюзных і савецкіх організацый ўсіх масавых мерапрыемстваў якія гарком КСМ праводзіць к МЮД'у. Аказваючы яму адпаведную дапамогу, як матэр'яльнымі срэдкамі, так і клюбамі мастацкімі сіламі.

Менгарком КП(б)Б

Інтэрнацыянальную работу— на вышыню новых задач

IX зьезд УсеЛКСМ па дакладу т. Хітарава запісаў: „Трэба дабіцца ў бліжэйшы час разгортваньня ў комсамольскіх арганізацыях шырокай інтэрнацыянальнай работы сярод комсамольскіх мас і б-й моладзі, забясьпечыўшы правільнае правядзеньне ленінскай нацыянальнай палітыкі".

Аднак, гэтыя дырэктывы радам комсамольскіх арганізацый яшчэ не ажыцьцяўлены.

Прыкладам дрэннай пастаноўкі інтэрнацыянальнай працы можа служыць Дрысенская арганізацыя КСМ. З 50 яч. раёну ні адна ня мае сувязі з замежнымі комсамольскімі арганізацыямі, ні адна за апошнія тры месяцы не правяла ні аднаго інтэрнацыянальнага вечару, ня мае гурткоў па вывучэньню белмовы.

Комсамольская яч. ільназаводу, які працуе з 1930 году і налічвае больш 100 чалавек, не наладзіла ні аднаго інтэрнацыянальнага вечару, з беларусізацыяй дрэнна; ёсьць выпадкі антысэмітызму і шовінізму на заводзе, але рашучага адпору не атрымліваюць. Калі работніцы пачынаюць высьмейваць адну з работніц яўрэйку—лепшую ўдарніцу, дык некаторыя члены бюро яч. далучаюцца да ганебных кпінаў.

На ільнагіганце, у саўгасе Боркавічах, большасьць комсамольцаў беларускай мовы ня ўжывае, гуртка па вывучэньню белмовы няма. За апошнія 3-4 месяцы ня было ніводнага інтэрнацыянальнага вечару, комсамольцы ня ведаюць, што такое інтэрнацыянальная работа. Бюро комсамольскай яч. опортуністычна бязьдзейнічае.

Такія ганебныя прыклады падае і другі ільнагігант Дрысеншчыны—Бігосава, а таксама і рад іншых комсамольскіх яч.

Прынцыпы вывучэньня ленінскай нацыянальнай палітыкі і масавая інтэрнацыянальная праца з моладзьдзю Дрысенскімі опортуністымі ў жыцьцё не праводзяцца.

Райком комсамолу тлумачыць гэта адсутнасьцю сувязі з замежнымі арганізацыямі, якую ім абяцалі наладзіць цэнтральныя організацыі.

МЮД павінен зрабіць рашучы пералом ў наладжваньні інтэрнацыянальнай працы па комсамольскіх яч. і сярод беспартыйнай моладзі.

На падставе вывучэньня прынцыпу ленінскай нацыянальнай палітыкі, наладжваньня соцспаборніцтва з замежнымі комсамольскімі організацыямі вывучэньня і ўкараненьня белмовы, барацьбы супроць усякіх скажэньняў ленінскай нацыянальнай палітыкі—шырокім разгортваньнем масавай інтэрнацыянальнай работы з беспартыйнай працоўнай моладзьдзю забясьпечым выкананьне дырэктыў IX зьезду Усе ЛКСМ і кантрольнага пленуму ЦК ЛКСМБ.

Казлоў.

Ударнымі брыгадамі сустракаем МЮД

Комсамолія Гомельшчыны разгарнула баявую работу па падрыхтоўцы да МЮДу, якая праходзіць у барацьбе за пасьпяховае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну. Колектыў заводу Ланцуцкага арганізаваў тры маладзёжныя ўдарныя брыгады імя 17 МЮДу. Брыгады зараз паказваюць узоры баявой работы па выкананьню прамфінпляну. Шырока разгорнута работа па ахопу рабочай моладзі комсамолам. Навічкі ўсе ахоплены соцспаборніцтвам, ударніцтвам і палітвучобай.



Вытворчая нарада ударнай брыгады

Колектыў „Рухавік рэволюцыі" арганізаваў 10 ударных брыгад на вытворчасьці. Колектыў паслаў ударную брыгаду з 60 чалавек ў колгас для ліквідацыі прарыву на ўборачнай кампаніі і сілосаваньні. Аднак, пасобныя колектывы, як „Везувій" і інш., яшчэ не прыступілі да падрыхтоўкі к МЮДу.

Усе колектывы павінны ўзяць прыклад баявой работы па падрыхтоўцы к МЮДу з колектыву „Ланцуцкага" і „Рухавіка рэволюцыі".

Мікушынскі.

Акомсамоленым „ФЗВ" сустракаем МЮД

Разгортваньне падрыхтоўкі да 17 МЮДу ідзе пад знакам барацьбы за пасьпяховае выкананьне ўборачнай кампаніі і падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы. У гэтай барацьбе комсамол Клімаўшчыны змагаецца за рост. За апошні час арганізацыя значна вырасла. Разгортваючы масавую работу на аснове індывідуальнага адбору, ФЗВ Клімавічы праходзіць да МЮДу акомсамоленым. Ячэйка на баявому ўзялася за падрыхтоўку да 17 МЮДу. Для навічкоў арганізаваны палітгурткі, гурток па вывучэньню становішча КІМу і гурток па вывучэньню вайсковай справы. Усе навічкі ахоплены гэтымі гурткамі. Шванда.

Організуйце ў нас ячэйку

У колгасе імя 13 Кастрычніка (Бялыніцкі р-н) значная колькасьць колгаснае моладзі прымае актыўны ўдзел у гаспадарчай рабоце.

Колгасная моладзь ужо некалькі раз ставіла пытаньне перад райкомам КСМ аб організацыі КСМ—ячэйкі, але ніхто не садзейнічае ёй у гэтым. Колгасная моладзь мае вялікае жаданьне ўступіць у рады КСМ.



Патрэбна, каб райком прыняў захады, і к МЮДу організаваў у нас ячэйку.

Д. Л.

Інтэрнацыянальнае выхаваньне-у штодзённую работу

Мы павінны з усёй яскравасьцю падкрэсьліць, што інтэрнацыянальнае выхаваньне знаходзіцца ў зусім нездавальняючым стане, з прычыны неразуменьня палітычнай важнасьці гэтай работы. Інтэрнацыянальнае выхаваньне тым больш важна сёньня, калі ў рады комсамолу ўліваюцца новыя мільёны маладых рабочых, батракоў і колгасьнікаў, якіх мы павінны выхаваць сапраўднымі ленінцамі-інтэрнацыяналістамі. Інтэрнацыянальнае выхаваньне павінна стаць на ўзровень новых задач, зрабіцца нашай штодзённай работай.

Некаторыя ячэйкі і па сёньня лічаць гэту работу па-за чарговай. Часта ячэйкі ня ведаюць, як разгарнуць інтэрнацыянальнае выхаваньне, яго формы і мэтады. Між тым формаў і мэтодаў шмат. Напрыклад, можна выкарыстаць штодзенна міжнародныя падзеі, факты ўвядзеньня новага рэгляманту ў польскіх турмах, забарона выхаду „Ротэ Фанэ", рэволюцыйныя падзеі ў Кітаі, Зах. Беларусі і г. д.

Шэфства і сувязь павінны быць таксама перабудаваны. У нас цяпер наогул дрэнна пастаўлена шэфства. Калі нават дзе і ёсьць сувязь, дык яна агульная і зусім недастатковая. Сувязь павінна быць пабудавана конкрэтна, калі гэта напрыклад комсамольцы швэйнай фабрыкі, дык яны павінны проста і конкрэтна напісаць аб рабоце і жыцьці сваёй фабрыкі і зьвязацца з замежнымі комсамольцамі швэйнай галіны вытворчасьці. Нядаўна была узьнята капіталістымі кампанія паклёпу аб прымусовай рабоце у нас на леса-распрацоўках. Тут патрэбна комсамольскім ячэйкам, якія працуюць на лесараспрацоўках, напісаць сваім замежным братом проста і конкрэтна аб сапраўдным становішчы і жыцьці на лесараспрацоўках і г. д.

Патрэбна ўзяцца за вывучэньне замежных моў.

Патрэбна усю сетку політвучобы падпарадкаваць справе інтэрнацыянальнага выхаваньня. На політзанятках ўвесьці інформацыю па міжнародных пытаньнях, расказаць аб падзеях дня за межамі.

Непаваротнасьці і недаацэнцы інтэрнацыянальнай работы ў комсамоле трэба палажыць канец.

Р.

Конвэер будаўніцтва і сілосаваньня павінен працаваць без перабояў

Абвешчаная ЦК ЛКСМБ дэкада суботнікаў скончылася. Суботнікі ў радзе раёнаў далі некаторыя, але зусім недастатковыя, зрухі ў выкананьні сілосаваньня. Па рэспубліцы плян выканан толькі на 3,9 проц.

Згодна пастанове ЦК УсеЛКСМ, да 17 МЮДу абвешчан ўсесаюзны комсамольскі суботнік па сілосаваньню.

К 17 МЮД'у прыйсьці з дадатнымі паказчыкамі ліквідацыі прарываў у сілосаваньні.

Комсамольскі суботнік даў значны зрух

Дрыса, 20.—Згодна пастановы бюро Дрысенскага РК КСМ, усе ячэйкі раёну 16 жніўня правялі ўдарны комсамольска-маладзёжны суботнік па сілосаваньню. За гэты дзень закладзена соткі тон сілоснай масы.

Дрысенская местачковая комсамольская ячэйка організавала суботнік па сілосаваньню у колгасе „Эмэс" і заклала 20 тон сілосу.

На выніках суботніка комсамольская організацыя ні ў якім разе застанавіцца не павінна, бо справа сілосаваньня па Дрысенскім раёне застаецца яшчэ напружанай.

Плян сілосаваньня ў раёне выканаңы толькі на 10—11 проц.

Комсамольскія ячэйкі Дрысеншчыны павінны напрудзіць усе сілы і дабіцца поўнага выкананьня пляну сілосаваньня. Абавязкі шэфа сілосаваньня комсамол павінен выканаць з гонарам.

Казлоў і Канончык

Змагацца за выкананьне

У Койданаўскім раёне сілосаваньне кармоў праходзіць зусім слаба. Па саўгасах плян сілосаваньня выканан на 4 проц, па колгасах на 3 проц, а ў радзе месц яшчэ не разгарнулі працы.

Пашыраны пленум Койданаўскага РК ЛКСМБ абвясьціў з 15 на 30 жніўня двухдэкаднік па сілосаваньню кармоў мобілізаваўшы на гэтую справу ўсю комсамольскую організацыю і рабоча-колгасную моладзь.

З 20 па 22 жніўня быў праведзены раённы суботнік з такім разьлікам, каб к 17 МЮД'у плян сілосаваньня кармоў выканаць на 10 проц.

Комсамол Койданаўшчыны выклікаў на соцыялістычнае спаборніцтва Чырвона-Слабодзкі р-н.

Тоўсьцік.

Не дапусьціць зрыву пляну Дуброўна

Сілосаваньне на колгасах праходзіць вельмі маруднымі тэмпамі. Меркавалася пабудаваць 2 сілосныя вежы ў 600 тон, але пакуль ніводная не пабудавана. Замест 1200 кубамэтраў сілосных траншэй выканана толькі 200.

З 178 сілосных ям, што капаюцца, гатовы толькі 102. У гэтых ямах трэ' было засілосаваць 3.569 тон, а пакуль-што засілосавана толькі 280 тон, альбо 6,2 проц. агульнага пляну. Значная частка колгасаў да сілосаваньня яшчэ не прыступала.

Да адказнасьці за ігнораваньне дырэктыў ЦК і СНК

Дырэктывы партыі і ўраду аб разьвіцьці соцыялістычнай жывёлагадоўлі не знайшлі свайго адбітку ў працы Рудзенскага с-с, Пухавіцкага р-ну.

Факты забою цялят і кароў у колгасах „Бязбожнік" і „Новы шлях" гавораць аб яўным шкодніцтве. У колгасе „Бязбожнік" каровы стаяць па калені ў гразі, ад чаго значна зьменшыўся ўдой.

Укомплектаваньне малочна-жывёлагадоўчых фэрм па сельсавецы выканана толькі на 50 проц.

Апошняя пастанова ЦК БП(б) і СНК БССР павінна забясьпечыць карэнны пералом у разьвіцьці жывёлагадоўлі па Рудзенскім сельсавеце.

Рыг. М.

Разгортваньне жывёлагадоўлі—у ногу з тэмпамі соцбудаўніцтва

Карэнны пералом павінен наступіць

Ажыцьцяўленьне пастановы ЦК і СНК аб разгортваньні соцыялістычнай жывёлагадоўлі ў Бабруйскім раёне праходзіць чарапашымі тэмпамі. Да гэтага часу толькі ў адным колгасе „Сьвет" абгаворана гэтая пастанова.

Раённая нарада старшынь колгасаў, малочна-таварных і саўгасна-таварных фэрм, якая адбылася 9-га жніўня, намеціла рад конкрэтных каштоўных мерапрыемстваў па ажыцьцяўленьню пастановы ЦК і СНК аб разгортваньні жывёлагадоўлі. Але-ж Колгассаюз забыўся пра гэтую пастанову і пакінуў яе бяз усякага руху. Не даслаў яе на месцы ў колгасы. Ініцыятыва колгасу „Сьвету" аб разгортваньні соцыялістычнай жывёлагадоўлі Колгассаюзам ня была падхоплена і не перанесена ў іншыя колгасы.



Ліквідаваць прарыў у жывёлагадоўлі

Слуцкі р-н мае жывёлагадоўчы напрамак, але не ва ўсіх колгасах раёну распрацавана адозва ЦК і СНК аб разгортваньні соцыялістычнай жывёлагадоўлі.

У 20 малочна-таварных фэрмах раёну знаходзіцца 1258 кароў. Па пляну-ж патрэбна было організаваць 19 малочна-таварных фэрм з агульным гуртам 1440 кароў.

Плян укомплектаваньня ня выканан.

Трэ' было здаць дзяржаве 1065 цэн. малака, а на 20 жніўня здадзена толькі 475. Будаўніцтва па колгасах ідзе вельмі маруднымі тэмпамі. З 16 абор, пабудавана 10, а прыстасавана толькі 5. Ня лепш справа з сьвінаводна-таварнымі фэрмамі, якіх у раёне 54, з 2819 сьвіней. Будаўніцтва сьвінарнікаў ідзе дрэнна. Усяго распачата 17 сьвінарнікаў.

Варойка Т.

Барацьбу за стандарт—на парадак дня МЮД'аўскага сьвята!

Дамагчыся панаваньня стандарту—значыць узьняць тэмп, палепшыць якасьць, з'экономіць матар'ял, рацыянальна скарыстаць рабсілу

Даць праменьням сонца поўную нагрузку

Торф у расьціле і клетках не павінен зімаваць

Даць 2000 комсамольцаў ударнай сушцы

Зьмяшчаемы сёньня матар'ял сьведчыць аб тым, што сваечасовая сушка, уборка і вывазка торфа да спажыўца не забясьпечваецца сучасным станам працы заводаў, што Белторп праяўляе консэрватызм у працы па мэханізацыі транспорта.

Сучаснае становішча вымагае ад Белторпу ў бліжэйшы час перагледзець і зьмяніць пляны вывозкі ў бок павялічэньня скарыстаньня мэханічных сродкаў вывозкі.

Спажыўцы торфу колгасьнікі і рабочыя прадпрыемств павінны забясьпечыць сушку і ўборку торфу, праз організацыю суботнікаў.

Сёньня, мы ў другі раз сыгналізуем аб заціску самакрытыкі на Асінторпе. Нерэагаваньне на сыгналы „Чырвонай Зьмены“ давялі да забароны выпуску насьценгазэцы.

Факт заціску самакрытыкі ня можа прайсьці па-за ўвагі адпаведных організацый.

З фронту торпараспрацовак

Першага верасьня канчаецца сэзон здабычы машына-фармовачнага, а першага кастрычніка—фрэзэрнага торпу.

Асноўная задача зараз: сушка, уборка і вывазка торпу да спажыўца. На гэтым вучастку ня зусім добра. На 20-е жніўня Белторпам высушана і ўбрана 64,2 проц. заданьня. Значна горш стаіць справа з сушкай разнога і малога гідраторпу, па першаму заданьню выканана на 33 проц. і па другому на 62 проц. Асабліва адстаюць заводы „Чырвоны сьцяг“—19,2 проц. „Закрашынскі мох“—24,9 проц. і „Свабода“—28.6 проц. Уперадзе ідуць па сушцы торпзаводы Грабянёва—88,3 проц. і Асінторп—81,81 проц.

Ня лепш з транспортам торпу да спажыўца. Белторп не прадугледзеў дастатковай мэханізацыі транспорту, Адсутнічае ў пляне вывазка торпу трактарамі і аўтотранспортам. 60 проц. торпу павінна быць вывезена гужавой цягай і толькі 40 проц. машыннай.

Не закончана будаўніцтва „драўлянага шляху на заводзе „Першае мая“ і Міхановічы, не забясьпечаны торпазаводы гужавой цягай, фуражом, саньмі і г. д.

Пасьля рабсельваенкораўскага зьезду

Газэта „Тарпянік“ прыдушана

(Ліст з Асінторпу).

„Чырвоная Зьмена“ пісала аб фактах заціску самакрытыкі на Асінторпе. Сэкратар партколектыву, тав. Белік, забараняў зьмяшчаць заметкі ў насьценнай і радыё-газэце пра партыйцаў, не ўзгадніўшы матар'ялы з бюро партколектыву.

Ажыцьцяўляючы пастанову рабсельваенкораўскага зьезду сэкцыі торпу і энэргэтыкі аб нізавым друку, рабселькоры Асінторпу дамагалася выпуску насьценных газэт на кожным вытворчым вучастку.



Тав. Белік за працай

Насьценная газэта „Тарпянік“, як і іншыя газэты Асінторпу, упарта змагалася за ліквідацыю прарыву і выкананьне промфінпляну. Па-за яе ўвагай не прайшлі факты бюрократычных адносін тав. Беліка, слабое кіраўніцтва партколектыву ў рэалізацыі пазыкі „3-га рашаючага“ і г. д.

З гэтага часу Белік пачаў цкаваньне сяброў рэдколегіі. З гэтага часу насьценгазэта рэклямуецца ім, як базарная і паклёпніцкая. Белік патрабуе разагнаць рэдколегію, а таксама кантраляваць заметкі пра партыйцаў.

І толькі опортуністычныя адносіны і нерэагаваньне партыйнай організацыі Асінторпу на сыгналы „Чырвонай Зьмены“ ды руба опортуністага заціскача самакрытыкі тав. Беліка—спынілі выпуск зубастай насьценнай і радыё-газэты „Тарпянік“.

Каваль.

Райпрамсаюз зрывае торпаздабычу

Слуцак. Бранаўскае торптаварыства выканала сэзонны прамфінплян на 60 проц. здабыта 960 тыс. паглін замест заданьня ў 1600 тыс,

Тэмпы здабычы не зьмяніліся, ня гледзячы на тое, што лік рабочых павялічыўся з 8 чал. да 80. Прыбываючыя рабочыя поўнасьцю не скарыстоўваюцца з-за адсутнасьці тачак і катальных дошак. Не забясьпечаны спэцвопраткай, прамтаварамі і прадуктамі харчаваньня, што значна павялічыла цякучасьць рабсілы.

Слуцкі Райпрамсаюз адмаўляецца забясьпечыць торптаварыства лесматар'яламі, чым зрывае выкананьне пляну торпздабычы.

Патрэбна неадкладнае ўмяшаньне РСІ.

Барысавец

Бязглуздыя законы мінуўшчыны

Дамагчыся поўнага ўкараненьня стандарту на ўсіх галінах нашай прамысловасьці, гэта значыць, даць значнае павышэньне тэмпаў, палепшыць якасьці, пры значнай экономіі матар'ялаў і рабочай сілы, на кожным вучастку соцыялістычнай гаспадаркі.

Гэтае палажэньне не патрабуе доваду.

Далейшае разгортваньне соцыялістычнай прамысловасьці, налажваньне масавай вытворчасьці высоўвае зараз яшчэ больш рашучае пытаньне стандартызацыі прамысловасьці. Мы не можам, мы не павінны выкідаць на вецер сродкі, выходзячы з бязглуздых законаў мінуўшчыны.

Ня гледзячы на ўсю відавочнасьць, сур'ёзнасьць гэтага пытаньня, грамадзкасьць, гаспадарнікі, усе тыя, хто павінен быць непасрэдным праваднікам стандарту на кожным вучастку працы, яшчэ зусім нічога не робіць для гэтага.

Каб прыцягнуць увагу ўсёй грамадзкасьці, да гэтай справы, прэзыдыум Дзяржплану БССР выказаўся за правядзеньне, пачынаючы з дня МЮД'у з 6 IX па 6-X г. г. месячніка стандартызацыі.

У дзень 17 МЮД стандарт атрымае пуцёўку на пабудовы у цэхі, да варштатаў. Комсамол павінен змагацца за канчатковую перамогу стандарту.

Быць організатарам

Кожная комсамольская ячэйка павінна быць конкрэтным організатарам барбы за стандартызацыю вытворчасьці свайго цэху. Комсамольскія брыгады, цэхі павінны абвясьціць барацьбу за стандартызацыю вытворчасьці, шчыльна ўвязваючы гэтую практычную працу з пераходам усіх галін вытворчасьці на стандартызацыю, з пропагандай гэтай ідэі сярод шырокіх колаў працоўных. Комсамольская ячэйка—організатар новых вынаходак, якія-б далі магчымасьць максымальна стандартызаваць усе галіны вытворчасьці.

„Чырвоная Зьмена“ абавязваецца быць непасрэдным удзельнікам і організатарам барацьбы комсамолу за стандартызацыю. Месячнік стандартызацыі ператворым у баявы старт для працяглай упартай барацьбы. Мы абавязваемся практычна кіраваць працай ячэек.

Выклікаем увесь друк, шматтыражкі ўзьняць барацьбу за стандартызацыю, узяцца за організацыю практычных мерапрыемстваў у выкананьні гэтай задачы.

Стандарт—на парадку дня МЮД'аўскага сьвята. Ленінскі комсамол павінен забясьпечыць стандарту перамогу, даць яму права грамадзянства.

А. С.

Насустрач новаму навучальнаму

Верасень кліча

Поўнасьцю ўкомплектаваць школы ФЗВ і забясьпечыць сваячасовы пачатак новага навучальнага году—у гэтым задача дня

Праз некалькі дзён павінен пачацца новы навучальны год у школах ФЗВ. Комплектаваньне школ да гэтага часу знаходзіцца ў надзвычайна крытычным стане. На большасьці школ комплектаваньне яшчэ не закончана. Рад комсамольскіх організацый яўна недацэньвае гэтай справы. Яны не ўлічваюць таго, што пасьпяховым комплектаваньнем школ ФЗВ мы забясьпечым у бліжэйшы час вялікія патрэбы прамысловасьці ў сапраўды падрыхтаваных рабочых кадрах.

Пераключым работу ўсёй організацыі на пасьпяховае ўкомплектаваньне і сваячасовы пачатак навучальнага году.

ФЗВ Віцебску непадрыхтаваны да навучальнага

Віцебск. ФЗВ абутнікаў пры фабрыцы Лебёрта зьяўляецца адзіным у БССР фабзавучам, які рыхтуе кадры для абутковай прамысловасьці. Ён мае ўсе магчымасьці далейшага росту і пашырэньня У восень павінна быць набрана 40 вучняў, а пасьля выпуску 90 чал. будзе праведзены яшчэ цадатковы набор. Аднак, школа да гэтага часу бяз самага неабходнага як сталы і лаўкі, абсталяваньня ФЗВ будаўнікоў не дапамог атрымаць яго.

Ня ў лепшым стане і ФЗВ краўцоў, дзе асеньні набор на віне Віцшвэю пастаўлен пад наяўную пагрозу зрыву. За жнівень месяц неабходна была набраць 105 чалавек, але, як абяцаў загадчык ФЗВ, будзе прынята ўсяго... 25 чал. Ці выканана гэта абяцаньне, нам невядома.

У ФЗВ панчошніц ліпеньскі набор быў правалены. Замест 70 чал. набрана толькі 4. Зараз павінна быць набрана 250 падлеткаў але ня складзены для гэтага неабходныя ўмовы.

З. Ваўчок

Не скарачаць сеткі ФЗВ

Летась пры Шклоўскай папяровай фабрыцы „Спартак“ быў адчынены ФЗВ, але ні заводакіраўніцтва, ні фабком не стварылі патрэбных умоў для працы школы.

Зараз аддзел кадраў Саюзпаперы паведаміў заводакіраўніцтва аб тым, што ФЗВ будзе законсэрваваны і прапанаваў ніякага прыёму ў гэтым годзе не рабіць, а набор мінулага году выпусьціць на правох ШУМП'у:

Бюро РК ЛКСМБ лічыць няправільным такое вырашэньне становішча ФЗВ і катэгарычна выказваецца супроць дэтэрмінованага выпуску і за тое, каб гэты фабзавуч надалей разгортваў сваю працу.

Керлін

Ад рэдакцыі; Рэдакцыя лічыць, што ў час разгортваньня будаўніцтва і значнага недахопу рабочай сілы нельга пайсьці на скарачэньне і задачу заваяваных позыцый у галіне разгортваньня сеткі школ ФЗВ, Належнае слова павінна сказаць ЦК ЛКСМБ і адпаведныя партыйныя органы.

Чарговае галавацяпства

Бабруйск. (Наш кор.) ФЗВ дрэвапрацоўшчыкаў павінен прыняць ў гэтым наборы 120 вучняў. Для гэтага неабходна было падрыхтаваць як памяшканьне для заняткаў, так і інтэрнаты.

15 чэрвеня вучні былі ў чарговым адпачынку. У гэты час можна было правесьці рамонт але адміністрацыя комбінату ня цікавілася гэтай справай. Толькі пасьля прыезду вучняў пачалі рамонт.

У пачатку сёлетняга будаўнічага сэзону недахоп рабочых кадраў па БССР, а таксама і па Менску ставіў пад наяўную пагрозу выкананьне будаўнічых плянаў,

Самацёк у сыстэме організацыі рабочай сілы, які захаваўся з часу беспрацоўя і па сёньня, прывёў да таго, што прыліў рабочай сілы з вёскі быў зусім нязначны. Паміж будаўнічымі організацыямі ішла барацьба за кожнага лішняга рабочага.

У гэты час комсамольскі колектыў Менбудтрэсту вылучыў некалькі брыгад, якія былі кінуты ў раёны для вярбоўкі рабочай сілы. Комсамольскія брыгады праводзілі ў раёне па некалькі тыдняў, трапіліся вялікія бродзі, на пабудову прыходзілі групы рабочых, якія прыходзілі на пабудову, пасьля аднаго-двух дзён пакідалі працу і ішлі ў іншыя будаўнічыя канторы, або зусім выяжджалі з гораду.

Вось другі факт. У сваім лісьце да рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“ комсамолец Крупскага р-ну м. Бабры У. П. піша, што ён быў мобілізаваны ў парадку комсамольскай мобілізацыі на дарожнае будаўніцтва. Калі ён зьявіўся ад начальніка работ, той накіраваў яго на другі вучастак, дзе паставілі яго на загатоўку камня.

Хлопца не ўцягнулі ў працу, нагрузілі рознымі дробнымі справамі і пасьля гэтага ён быў звольнен, бо не справіўся з сваімі асноўнымі абавязкамі.

* * *

6-га верасьня ў строй новых гігантаў увойдзе Віцебскі панчошны комбінат. Штодня пушчаюцца новыя заводы і фабрыкі, разрастаюцца старыя прадпрыемствы, адчыняюцца новыя цэхі.

Па новаму працаваць, па-новаму кіраваць (Сталін)

Аб першай рашаючай умове

Новыя фабрыкі і заводы патрабуюць вялікай колькасьці рабочае сілы, варштаты—кіраўнікоў.

Тав. Сталін на апошняй нарадзе гаспадарнікаў вызначыў шэсьць задач гаспадарчага будаўніцтва, якія ўзьнікаюць у сувязі з новымі абставінамі.

Адна з асноўных умоў—організацыя рабочай сілы, бо „нельга больш разьлічваць на самацёк рабочай сілы. Ад політыкі самацёку трэба перайсьці да політыкі організаванага набору рабочых для прамысловасьці“ (Сталін).

Соцыялістычная перабудова сельскай гаспадаркі стварыла такія ўмовы, пры якіх, кажучы словамі тав. Сталіна, вёска перастала быць „мачыхай“ для селяніна, бо на глебе колектывізацыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыі на гэтай базе кулацтва, як клясы, селянін стаў асядаць у вёсцы, і самацёк у пераходзе рабочай сілы з вёскі ў горад, бязумоўна, спыняецца.

У гэтых умовах перад усёй комсамоліяй, як прамысловасьці, так і сельскай гаспадаркі, паўстае баявая задача. Побач з рэалізацыяй указаньняў Сталіна ў галіне ліквідацыі ўраўніляўкі, пераходу на гаспадарчы разрахунак і падрыхтоўкі новай рабочай тэхнічнай інтэлігенцыі,—змагацца за організаваны набор рабочай сілы.

На глебе правільнага ўліку рабочай сілы і лепшай растаноўкі працы ў колгасе, колгасныя ячэйкі павінны дабіцца організацыі брыгад і пасылкі іх на вытворчасьць. Ад імя свайго колгасу гэтыя брыгады павінны організаваным парадкам уліцца ў вытворчасьць.

Адначасова з гэтым, вясковая комсамолія павінна змагацца з тымі скажэньнямі, якія вельмі часта сустракаюцца ва ўзаемаадносінах паміж адыходнікамі і колгасамі. Бываюць выпадкі, калі адыходнікаў выключаюць з колгасаў, іхныя сем'і пазбаўляюць усіх ільгот, чым ня толькі ня спрыяюць разгортваньню прыліву адыходнікаў, а зрываюць яго.

Задача вясковай комсамоліі змагацца з такімі скажэньнямі, выкрываць кулацкую агітацыю, складаць і выконваць дагаворы з прадпрыемствамі.

Перад комсамолам вытворчасьці стаяць ня менш адказныя задачы.

Неабходна дабіцца, каб брыгады ў колгасы пасылаліся таксама організаваным парадкам, каб комсамольцы гэтых брыгад сапраўды растлумачвалі сутнасьць адыходніцтва і дапамагалі-б колгаснай комсамоліі ў організацыі гэтай работы.

Новыя рабочыя кадры, якія ўліваюцца з колгасаў у вытворчасьць, павінны сустрэць самыя таварыскія адносіны з боку старых рабочых і асабліва комсамолу. Навейшыя конструкцыі абсталяваньня павінны быць добра растлумачаны, каб даць магчымасьць кожнаму новаму рабочаму адразу ўцягнуцца ў кола сваіх вытворчых процэсаў. Для гэтага павінны быць організаваны куткі адыходнікаў, дзе-б яны маглі азнаёміцца з сыравінай, з дэталямі варштатаў, з усім тым, з чым кожнаму прыдзецца сустрэцца на вытворчасьці.

Культурна-бытавыя ўмовы адыграюць ня менш важную ролю ў замацаваньні тых кадраў рабочых, якія прыдуць з колгасаў. Неабходна дабіцца, каб добрая сталовая, чысты барак, клюб былі сапраўды прыстасаваны так, каб гэтыя рабочыя кадры маглі-б уцягнуцца ў вытворчасьць, ня кідаючыся на пошукі лепшых умоў працы.

Сюды адносіцца і пытаньне правільнай організацыі сыстэмы заработнай платы. „Лявацкая“ ураўніляўка не магла спрыяць зацікаўленасьці рабочых да ўладаньня кваліфікацыяй і вывучэньня тэхнікі сваёй справай. Новая сыстэма заработнай платы павінна забясьпечыць зацікаўленасьць усіх слаёў рабочых у павышэньні сваіх тэхнічных ведаў,

Для практычнай рэалізацыі гістарычных указаньняў тав. Сталіна патрэбна мобілізацыя ўвагі ўсёй комсамоліі на гэты адказны вучастак, які вылучан новымі абставінамі і новымі задачамі

Л. Глезэр.

Комсамольскія сілы і энтузіязм-на ільняныя палі!

Мобілізацыю комсамольцаў у лік 300 скончыць да 1 верасьня

Згодна пастановы ЦК ЛКСМБ, мобілізацыя 300 комсамольцаў для дапамогі ільнасаўгасам ва ўборцы тэхнічных культур і пасылка іх на вучасткі барацьбы за лён павінна быць скончана да 1-га верасьня. Комсамольскія організацыі Віцебску, Бабруйску, Слуцку і Полацку павінны забясьпечыць сваячасовую мобілізацыю комсамольцаў і пасылку іх у вызначаныя ільнасаўгасы. Ад выкананьня гэтых умоў у вялікай меры залежыць насьпяховасьць барацьбы за ўборку і апрацоўку тэхнічных.

Выязная рэдакцыя „Чырвонай Зьмены“

Зрух ёсьць, але нязначны

Мы нядаўна сыгналізавалі аб тым, што ўборка тэхнічных культур ў саўгасе Бігосава (Дрысенскі р-н) знаходзіцца ў катастрафічным становішчы што рад тармазоў зрывае сваячасовае сканчэньне ўборкі, што комсамольская організацыя ільнасаўгасу стаяла ў баку ад гэтага важнейшага вучастку работы.

15 жніўня выязная рэдакцыя „Чырвонай Зьмены“ улічваючы такое становішча, склікала агульны комсамольскі сход сумесна з саўгаснай рабочай моладзьдзю. На сходзе была шырока абгаворана становішча з уборкай лёну і прынят рад конкрэтных мерапрыемстваў, каб прысьпешыць тэмпы ўборкі.

На сходзе організаваны дзьве ўдарныя комсамольскія брыгады. Усе комсамольцы абвясьцілі сябе ўдарнікамі на час уборачнай кампаніі і ўзялі на сябе адказнасьць за сваечасовае сканчэньне ўборкі лёну.

Выязная рэдакцыя „Чырвонай Зьмены“ ў ільнасаўгасе Бігосава выпусьціла нумар насьценгазэты, завастрыўшы ўвагу усіх саўгасьнікаў на пытаньнях сваячасовага сканчэньня ўборкі лёну.

Усю працу па падрыхтоўцы да 17 МЮДу комсамольская ячэйка цесна ўвязала з барацьбой за ўборку і першапачатковую апрацоўку лёну.

Комсамольцы зараз уключыліся ў барацьбу за пераходны сьцяг РК ЛКСМБ

17 жніўня адбыўся агульны сход саўгасьнікаў, Сход вынёс пастанову ў трохдзённы тэрмін дабіцца поўнага ўкараненьня зьдзельшчыны і наладжваньня правільнага ўліку працы дабіцца каб кожны брыгадзір нёс асабістую адказнасьць за ўборку лёну на сваім вучастку.

Усе гэтыя мерапрыемствы далі некаторыя зрухі у барацьбе за лён. Крывая ўборкі лёну пайшла ўгару. Аднак сказаць, што посьпехі ўборкі забясьпечаны, нельга.

У саўгасе вельмі востра стаіць пытаньне з рабочаю сілай. Пры сучаснай колькасьці рабочых скончыць уборку к тэрміну немагчыма. Каб закончыць ўборку к 30. трэба каб на полі штодня працавала 465 чал. а зараз працуе ўсяго 90.

Райорганізацыі ўсё яшчэ ня сталі на шлях дапамогі саўгасу, праз організацыю суботнікаў.

Патрэбна безадкладна забясьпечыць дапамогу ільнасаўгасу па ўборцы тэхнічных культур, трэба кінуць комсамольцаў на ільняныя палі—адказьнейшыя вучасткі стварэньня с равіннае базы для тэкстыльнае прамысловасьці.

Казлоў, Канончык.

На Случчыне ўборка тэхнічных правальваецца

Уборка лёну і яго папярэдняя апрацоўка зьяўляюцца адказьнейшай задачай, бо ад гэтага ў значнай ступені залежыць і выкананьне вытворчай програмы тэкстыльнай прамысловасьці. Аднак, на Случчыне гэта важнейшая кампанія не стала яшчэ ў цэнтры ўвагі грамадзкасьці, вакол яе не сконцэнтравана грамадзкая думка.

та ніякай увагі, яны не організавалі дапамогу колгасам ва ўборцы.

РК ЛКСМБ, замест конкрэтнага кіраўніцтва комсамольскімі ячэйкамі ў справе мобілізацыі іх на ўборку лёну, абмяжоўваецца дырэктывамі.

Райком зараз цалкам заняўся пытаньнямі росту комсамольскай організацыі, але ня ўвязвае іх з



У выніку опортуністычнай недаацэнкі раённымі ор-цыямі неабходнасьці хутчэйшага сканчэньня ўборачнай кампаніі тэхнічных культур тэмпы ўборкі лёну зусім незадавальняючыя. Кантрольнае заданьне выканана толькі на 12 проц.

Шасобныя комсамольскія ячэйкі зусім бязьдзейнічаюць у гэтым напрамку. Лён чакае рабочых рук, а комсамольцы не зьвяртаюць на гэ-

гаспадарча-палітычныя мерапрыемствамі і ў прыватнасьці з кампаніяй уборкі тэхнічных. У выніку—комсамольская організацыя ў баку ад правядзеньня гэтага важнага мерапрыемства.

Комсамольская організацыя павінна перакінуць усе свае сілы на фронт уборачнай кампаніі, ліквідаваць усе прарывы на фронце ільнаўборкі.

Я. Жылка

Прарыў будзе ліквідаваны

Прарыў ва ўборцы лёну ў шклоўскім р-не ўжо амаль што ліквідаваны. Райком ЛКСМБ на дапамогу колгасам ва ўборцы тэхнічных культур мобілізаваў усё раённае настаўніцтва і навучальныя ўстановы, якія разьбіты на асобныя брыгады і разасланы па колгасах. Работа гэтых брыгад дала значны зрух у выкананьні пляну ўборкі.

А. Хмарны

Падрыхтавацца да заняткаў

1-га верасьня школы павінны прыняць вучняў

Да пачатку навучальнага засталося **2** дні

2 дні засталося да „Дня вучобы“. Два дні да пачатку навучальнага году. Усе організацыі, ад партыйна-комсамольскіх да піонэрскіх, павінны мобілізаваць усе сродкі і магчымасьці на тое, каб ліквідаваць усе прарывы і недахопы за гэтыя два ўдарныя дні. Неабходна, каб усе заводы і фабрыкі разгарнулі ўдарную работу па падрыхтоўцы к „Дню вучобы“.

Прыцягнуць зрыўшчыкаў да адказнасьці

Віцебск. Падрыхтоўка да навучальнага году у Віцебску наладжана дрэнна. Сёлета ў Віцебску меркавалася адчыніць тры школы але яны яшчэ ня скончаны, Школа ў „Пролетарскай слабадзе“, якая павінна ахапіць усіх дзяцей рабочага пасёлку, не дабудавана. Гаксама ня будуць гатовы к 1-му верасьня астатнія дзьве школы. Самае-ж дрэннае гэта тое, што станам падрыхтоўкі да навучальнага ніхто ня цікавіцца.

Рамонт старых школ гораду яшчэ ня скончаны, за выключэньнем некаторых. З кадрамі настаўнікаў таксама дрэнна Па горадзе не хапае каля 25 настаўнікаў 2-га концэнтру і 15 настаўнікаў 1-га. Школы яшчэ не здалі заяўкі на абутак і канцэлярскія прылады. Забясьпечаньне школ гарачым сьнеданьнем вісіць яшчэ ў паветры.

Райінспэктарыят не паклапаціўся забясьпечыць школы Віцебску дрывамі, што ставіць заняткі пад пагрозу зрыву ў зімовыя халады. Аб „дні вучобы„ ніхто ня думае,

Гарком КП(б)Б і РСІ неабходна тэрмінова выявіць, як рыхтуюцца належныя організацыі да новага навучальнага.

Давід Уін



Паскорыць тэмпы будаўніцтва

У комуне „Чырвоны Барацьбіт“, Іванскага сельсавету, Чашніцкага р-ну, будуецца новая школа, якая павінна быць гатова да новага навучальнага году.

Але пакуль-што школа ня скончана. Паложана ўсяго толькі 5 вянкоў (а трэба 20). Лесаматар'ял для гэтай школы быў загатоўлен яшчэ ў маі 1930 г. будаўніцтва-ж пачалося толькі ў чэрвені 1931 году. Сярод будаўнікоў не разгорнута соцспаборніцтва і ўдарніцтва, таму і будаўніцтва ідзе вельмі маруднымі тэмпамі.

Школу меркавалі зрабіць сямігодкай-ШКМ, але будуецца яна па прынцыпу чатырохгодкі, што зьяўляецца яўным непаразуменьнем.

РайРСІ павінна пакласьці канец такім безадказным адносінам да школьнага будаўніцтва.

Каплан.

Аб „дні вучобы“ нават і ня думаюць

СЛУЦАК. Падрыхтоўка да навучальнага году на Случчыне праходзіць самацёкам. Школы будуюцца надзвычайна марудным тэмпамі. Астатнія пабудовы ня ўсюды скончаны. Яшчэ горш з новымі школамі. Рад школ ня будуецца з-за адсутнасьці будматар'ялаў. Леспромгас, райсаюзпрамсаюз і інш. ня турбуюцца. Недапушчальныя адносіны да школьнага будаўніцтва заўважваюцца і з боку некаторых устаноў і організацый (Даросінскі с-с, ячэйкі гэтага сельсавету), якія гэту справу зусім выкінулі з кола сваёй дзейнасьці.

Вакол школьнага будаўніцтва і падрыхтоўкі да новага навучальнага году грамадзкая думка ня складзена, школа ня ў цэнтры ўвагі комсамольскай організацыі. РК ЛКСМБ опортуністычна адносіцца да навучальнага году і не бярэ ніякага ўдзелу ў падрыхтоўчай рабоце. Райком не абгаварваў пытаньняў падрыхтоўкі, а аб „Дні вучобы“ нават і ня думае.

Трэба моцна ўдарыць па восьбітах опортуністычнай недаацэнкі пасьпяховага сканчэньня школьнага будаўніцтва і падрыхтоўкі да новага навучальнага году.

Праўленьня Слуцкага р-ну павінны ліквідаваць прарыў на фронце нацкультбудаўніцтва, а райком комсамолу зараз-жа не адбудаваць сваю работу на-новаму, павярнуцца тварам да патрабаваньняў навучальнага году і выконваць абавязкі сапраўднага шэфа ўсеабучу.

Брыгадзір „Ч.З.“ Я. Жылка.

Каробкіну і яму падобным няма куды сьпяшацца

Падрыхтоўка да новага навучальнага году па Чырвона-Слабодзкім р-не праходзіць надзвычайна дрэнна. Большасьць сельсаветаў не зважаюць на гэту работу. Будаўніцтва школ ідзе чарапашымі тэмпамі. Будынку Мазалеўскай школы не хапае будматар'ялаў для пакрыцьця. У новай Заўшыцкай выведзены толькі сьцены а старая школа не рамантуецца. Школы ў в. Лютовічы яшчэ без падлогі, Мальштовіцкая школа стаіць без акон. Не хапае інвэнтара для Мазалеўскай, Заўшыцкай, Усткаўскай, Замагільскай, Вескай і іншых школ.

Таксама не хапае настаўнікаў. Каля 40 старых настаўнікаў не зьявіліся ў р-н пасьля адпачынку. Частка кінула настаўніцкую працу.

Райком комсамолу і райполітінспэктарыят „мобілізавалі“ 10 комсамольцаў на ліквідацыю прарываў у галіне ўсеагульнага навучаньня, але ня ўсе 10 чалавек прыступілі да выкананьня дырэктывы.

Некаторыя комсамольскія ячэйкі яўна опортуністычна адносяцца да падрыхтоўкі навучальнага году. Сакратар Жыліхаўскай ячэйкі ЛКСМБ Каробкін кажа: „Няма чаго сьпяшацца з падрыхтоўкаю, яшчэ пасьпеем“.

Райкомам партыі і комсамолу і РСІ неабходна прыняць тэрміновыя захады, каб забясьпечыць сваячасовы пачатак навучаньня ў Чырвона-Слабодзкім р-не. Неабходна прыцягнуць да суровай адказнасьці зрыўшчыкаў усеагульнага навучаньня.

Брыгадзір „Ч. З“. Алесь Курловіч.

Паведамленьне

30 га жніўня 1931 г., а 2-й гадз. дня, у памяшк. ЦК ЛКСМБ склікаецца нарада па пытаньню ўдзелу комсамолу ў дарожным будаўніцтве. На нараду запрашаюцца прадстаўнікі рэд. газ. „Чырв. Зьмена“, Аўтадору, ЦС АСОавіяхэму, Галоўдартрансу, ЦБ ДКО. Менскага гаркому ЛКСМБ.

Просьба зьявіцца без спазьненьня.

Нам. заг. орг.-інстр. аддз. ЦК ЛКСМБ Гейдэ

Слухайце, слухайце, слухайце!

3 верасьня, а 9-й гадзіне ўвечары—пашыраны радыёмітынг мюдаўскай камісіі з удзелам комсамольскага актыву.

На мітынгу ўдзельнічаюць:

Менгарком (20 хвіл.), друкарня імя Сталіна, завод Варашылава, „чырвоназьменаўская“ комуна, Віцебскі гаркамол (10 хв.), колектыў „Сьцяг індустрыялізацыі“, Магілеў (10 хв.), Барысаў (10 хв.), Койданава (10 хв.), ячэйка МТС, Слуцак (8 хв.), Бабруйскі РК (15 хв.), Тураў (8 хв.), Гомельскі РК (15 хв.), колектыў Гомсельмашу, Асінторп (10 хв.) Дрыса (12 хв.), райком і ячэйкі ільназаводу.

Падрабязнасьці ў „Чырвонай Зьмене“ № 200 (1469), ад 29 га жніўня 1931 г.

Ад штабу па збору папяровай макулатуры

31 жніўня, а 5-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні рэдакцыі „Чырвоная Зьмена“ склікаецца паседжаньне штабу па збору папяровай макулатуры. На паседжаньне выклікаюцца тав. Маеўскі, Рузаў, Ханін, Пэральман, Бабушкін, Мільток, Валынскі, Гімерштэйн, Сарокін і Шышкоў.

У сувязі з важнасьцю пытаньня яўка абавязкова.

Штаб

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Кожны юнкор—ударнік,
кожны ўдарнік—юнкор

Юнкорыя Менску

Агульна-гарадзкі зьлёт юнкораў-ударнікаў па пытаньню:

„прамова т. Сталіна і задачы друку“

адбудзецца 31 жніўня, а 7 гадзіне ўвечары, у памяшканьні рэдакцыі „Чырвоная Зьмена“ (Карла Маркса, 38)

Ударныя брыгады! Юнкоры-ударнікі! Усе—на зьлёт!

Друкарня імя тав. Сталіна.

Галоўлітбел № 599